
07/1231

БЕЛАРУСЬ

Штадзенная політычна-эканаміцкая і літэратурная газэта

пад агульным кіраўніцтвам Язэпа Лёсіка.



№ 132 (188). Менск, Аўторак 22 чэрвеня 1920 г. № 132 (188).

июнь

Паведамленьне Гэнэральнага Штабу Польскіх Войскау.

Ад 19—VI.

На паўночным фронце на вучастку ракі Аугы вораг абстрэльваў гураганным агнём нашы позыцыі між возерам Доўгае і вёскай Чаркі; посьле гэтага ён пашоў у атаку, каторая была адбіта нашымі войскамі.

К паўдню ад балот возера Ельні нашы аддзелы контр-атакаю пасунуліся на ўсход на лінію ракі Верасьні; ад Марцінавічы да яе ўтокі і да Ушы ідуць вялікіе баі.

На фронце к паўдню ад Верасьні да Днястра вялікіх стычак ня было.

Ад 20—VI.

К поўначы ад Барысава да Дзьвіны—дзеельнасьць разьведчыкаў з абодвух бакоў.

На Палескім вучастку разыграліся вялікіе баі на лініі Ушы.

Далей к паўдню контакту з ворагам няма.

1 Замясьціцель шэфа Гэнэральнага Штабу
Кулінскі,
Гэнэрал-падпаручнік.

Конфэрэнцыя Надбалтыцкіх дзяржау.

З Надбалтыцкіх краёў надыходзяць самые разнастайные і нязгодные весткі аб тым, што там адбываюцца, ці будуць адбывацца конфэрэнцыі Надбалтыцкіх дзяржаў.

З Рыгі прышло паведамленьне, што там адбываецца нарада прадстаўнікоў латвійскага ураду з прадстаўнікамі грамадзянскіх і эканаміцкіх арганізацый. На гэтай нарадзе была ўхвалена рэзалюцня абканечнасьці ўтварэньня саюзу адроджаных народаў—Эстоніі, Латвіі, Літвы і Польшчы.

З Юр'ева паведамляюць, што там адбылося першае пасяджэньне конфэрэнцыі, на каторым вырашаліся пытаньні аб устанаўленьні граніц і ўтварэньні эканаміцкага саюзу. Ёсьць яшчэ і такое паведамленьне, што прадстаўніком дзяржаў была зроблена ад імя расійскай (sic!) камісіі пропазыцыя спыніць ваенную дзейнасьць проці Савецкай Расіі.

Нарэшце, апошняе паведамленьне гаворыць аб тым, што конфэрэнцыя Надбалтыцкіх дзяржаў адбудзецца 10-15 ліпеня. Патрэбная падгатоўчая праца ўжо скончана. Выясьнілася, што на гэтай конфэрэнцыі будуць прадстаўлены: Фінляндыя, Эстонія і Латвія. Аб Польшчы і Літве не вядома, ці будуць яны прадстаўлены на конфэрэнцыі. Беларусь і Украіна, як паведамляюць, ня будуць мець магчымасьці быць на гэтай конфэрэнцыі, але там будзе Румынія.

Весткі туманные, ня выразные. Але нешта некае ёсьць. Гэта ясна. Патрэба ў гэтакай конфэрэнцыі ёсьць. Яна адбудзецца. Але якіе будуць рэзультаты гэтай конфэрэнцыі? Іх было ўжо многа. Былі ня толькі конфэрэнцыі з прадстаўнікоў ад урадаў, але былі навет конфэрэнцыі прадстаўнікоў, усіх соцыялістычных партый. Тым часам усе яны нічога не далі. Наадварот, яны толькі паглыбілі і пашырылі тую пропасьць, якая ляжыць паміж адроджанымі народамі. Асабліва рэльефна гэта выступіло на соцыялістычнай конфэрэнцыі.

Паміж Эстоніяй і Латвіяй, Літвою і Латвіяй ідуць тэрыторыяльные спорькі. Яны ня спыніліся, бо ня уладжаны, дагэтуль. Часта пасрэдніцтво дзеля пагаджэньня гэтых спорак брылі на сябе прадстаўнікі Антанты, але дарэмна. Былі моманты, калі здавалася, што споры гэтые могуць быць вырашаны толькі збройнай сілай. Спорькі гэтые ня скончаны і цяпер. Гэта натуральна перашкаджае ня толькі эканаміцкім, ці політычным саюзам, але навет мірным суседзкім адносінам. Тым часам, гэтые спорькі лёгка можна было б пагадзіць, калі б маладые дзяржавы маглі згаварыцца ды заключыць паміж сабою згоду і саюз. Цэлые палосы тэрыторый, з нацыянальнай большасьцю другіх народаў, або эканаміцкі патрэбные для існаваньня дзяржаў, былі-б нэўтралізованы дзеля ўзаемнага здавальненьня.

Але калі споры паміж Эстоніяй і Латвіяй, з Латвіяй і Літвою калі небудзь і пашанцуе пагадзіць, то зусім безнадзейнае тое палажэньне, у каторым знаходзяцца паміж сабою Польшча і Літва. Паміж імі няма ні міру, ні вайны. Ковенскіе уладары не адзін раз ужо палохалі, што польска-літоўскіе спорькі будуць скончаны збройнай сілай, але гэтые пагрозы больш сьмешные, як рэальные. Польшча рахуецца з фактамі. Засядаючые ў Коўне дзяржаўные мужы прысвоілі сабе чужую гісторыю, чужы гістарычны скарб і стараюцца давесьці эўропэйскай грамадзянска-політычнай думцы, што Ковенская тарыба ёсьць тая гістарычная Літва, каторая была некалі, і што нібы окупацыя польскім войскам Вільні і некаторых частак этнаграфічна-літоўскіх зямель (!) замінае тарыбаўцам прыступіць да дзяржаўнага будаўніцтва.

Польшча ня толькі нічога не зрабіла, каб вытлумачыць Эўропе гістарычную праўду і ліквідаваць калідорную політыку літоўскіх тарыбаўцаў, а наадварот, забраўшы ў барацьбе з расійскімі бальшавікамі частку беларускіх, або гістарычна-літоўскіх зямель, нічога не сказала аб іх будучай долі. І дзеля гэтага ў Эўропе пры дапамозе ўдыглівых суседзяў і ворагаў Польшчы ўтварылася такая думка, што Польшча імпэрыялістычная, што яна забірае чужые землі і замінае адраджэньню літоўскай (чытай: жмудзкай) дзяржавы.

Гэта вялікая абмылка збоку польскіх політычных дзеячоў, за каторую прыходзіцца цяпер адказваць і Польшчы, і беларускаму народу. Калі-б летась у Вільні, гэтай сталіцы гістарычнай Літвы, быў утворан вышэйшы орган дзеля абароны інтарэсаў усіх народаў, насяляючых гістарычную Літву; калі б гэты вышэйшы орган быў сапраўдным прадстаўніком волі народаў, а ня цывільным упраўленьнем „усходніх зямель“ пад камандаю з Варшавы,—то ці іставаў-бы цяпер літоўскі урад з яго антыпольскай політыкай? Ці быў бы той гоман, каторы мы чуем цяпер, калі Польшча патрэбавала ад Расіі адказацца ад тых зямель, што ляжаць на заход ад граніц 1772 г.? Мы думаем, што гэтага-б ня было. Тагды б трэбаваньне Польшчы было б нормальным, справядлівым і зразумелым для Эўропы.

Цяпер паведамляюць, што Беларусь і Украіна ня будуць прадстаўлены на конфэрэнцыі. Чаму? Хіба дзеля таго, што гэтым народам, на долю каторых выпала выдзяржаць увесь цяжар расійскага імпэрыялізму, не пашанцавала дагэтуль вызваліць сваіх зямель, утварыць войска, дзяржаўны апарат, наладзіць урад і нормальнае жыцьцё? Іншых прычын мы ня бачым. Псіхолёгія адроджаных і завёўшых у сябе парадак народаў стала цяпер іншай як тагды, калі яны самі перажывалі тое, што перажывае цяпер беларускі ці украінскі народ.

Ці ня маюць права Беларусь і Украіна зрабіць даганы сваім суседзям і таварышом па царскай няволі, што ніхто не падтрымаў іх у той момант, калі яны бароліся з дужэйшым праціўнікам? Бо гэтак яно і было. У барацьбе з бальшавікамі адроджаные народы ня мелі контакту і адзінства. Ня было ваеннай падзержкі, адзінага фронту, а былі асобные, незалежные ад агульнага палажэньня выступленьні. Эстонія памірылася, Латвія і Фінляндыя прыпынілі вайну і пачалі міравые перагаворы, як раз тагды, калі пачала вырашацца доля Беларусі і Украіны, калі бальшавікі, рызыкуючы ўсім, усім сваім цяжарам пад камандаю гэнэрала Брусілава навaліліся на Польшчу. Польшча засталася адна. Яна адна павінна адбівацца ад дужага праціўніка, ня маючы ня толькі фізычнай, а і маральнай падзержкі.

Дагэтуль ніводная з адроджаных дзяржаў, апрача Польшчы і Фінляндыі, ня маюць прызнаньня de jure.

Мы не пакладаем ніякіх надзей на маючую адбыцца конфэрэнцыю. Яна не прынясе нічога ня толькі беларускаму народу, але і, наогул, нікому. Бо трэба сказаць, што з самага пачатку, калі пачалося вызваленьне падняволеных народаў, была зроблена псіхолёгічная абмылка. Ніхто не падумаў аб тым, што сваімі ўласнымі сіламі ніводзін з народаў ня справіцца з сваім ворагам; ніхто не падумаў аб тым, што аднача́сна з унутраным будаўніцтвам трэба было прыступіць да ўтварэньня саюзу, або фэдэрацыі ўсіх адроджаных народаў.

Мы верым, што здаровы розум возьме верх, што патрэба прывядзе к брацкаму саюзу і згодзе. Але гэта будзе ня скора. Народы перажывуць яшчэ многа цяжкіх дзён, покі пераканаюцца, што толькі ў саюзе, або фэдэрацыі—залог іх адраджэньня, расцьвету і лепшай будучыны.

Г—ры.

Новы аграрны закон у Англіі.

Нядаўна ангельскі урад увёс у Палату грамад проект аграрнага закону. Поўны тэкст гэтага закону яшчэ ня мог быць апублікаваны, але ў ангельскім друку ёсьць рэзюмэ яго, аснованае на офіцыяльных даных.

Рэзюмэ гэтае дае поўнае прадстаўленьне аб проектуемым законе і мы лічылі азнаямленьня карысным у шмат якіх адносінах.

* * *

Англія як ведама, зьяўляецца краем дробнай арэнды. Арандатар грае там ролю нашага селяніна—ўласьніка. А зямля, бадай што ўся, належыць буйным памешчыкам, каторые самі не вядуць гаспадаркі. Аднача́сна Англія зьяўляецца краем надзвычайна высокай сельска-гаспадарскай культуры, але свае продукты земляробства складаюць вельмі малую долю народнага спажываньня. Гэта значыць, што Англія патрабуе далейшага разьвіцьця свае сельскай гаспадаркі. Пры гэтым, Англія становіць клясычны край непарушных асноў сьвяшчэннай уласнасьці, гдзе ўсё ж такі дзяржава так далёка заходзіць з сваім кантролем у прыватнае гаспадарскае жыцьцё, што гэтага, здаецца, ніяк ня можна было чакаць.

Усе гэтые факты *аўтаматычна* прадыктавалі асновы, на каторых павінен быў быць пабудован закон, каторы мае упарадкаваць сельскую гаспадарку краю. І гэтые ж факты раней абрысавалі гістарычную і соцыяльную цэннасьць гэтакага закону.

* * *

Якіе заданьні ставіць сабе гэты закон? Гэтакіе: забясьпечыць дзяржаве магчымасьць свайго дагляду ў прыватнай гаспадарцы дзеля таго, каб адтрымаць у краю максімальную колькасьць прадуктаў сельскай гаспадаркі,—прычым, гэтакіх, каторые дзяржаве найбольш патрэбны. Забясьпечыць дзяржаве магчымасьць рэгуляваньня цэн на гэтые прадукты дзеля барацьбы з несправядлівымі павялічанымі вымаганьнямі сельскіх гаспадароў.

Абараніць сельскага гаспадара з аднаго боку ад сусьветнай конкурэнцыі; з другога боку, дзеля таго, што сельскі гаспадар зьяўляецца галоўным чынам арандатарам,—ад уладара, або ўласьніка зямлі, і аднача́сна забясьпечыць краю ня толькі той высокі стан сельскага гаспадарства, каторы там ёсьць, але і магчымасьць далейшага разьвіцьця сельскай гаспадаркі. І, нарэшце, абараніць сельска-гаспадарскі пролетарыят.

Алгэтуль мы бачым, што проэкт новага аграрнага закону ангельскага ураду ставіць сабе шырокае заданьне ўпарадкаваць аграрную справу народнай гаспадаркі Англіі, палажыць аснову ўрэгуляваньня яе, выходзячы з шырокіх і глыбокіх соцыяльных заданьняў, вырашаючы сабе пытаньні, высунутые жывым жыцьцём.

Асабліва важна зазначыць абарону інтарэсаў арандатара проціў уласьніка зямлі,—пытаньне, стаўшае асабліва вострым у самы апошні час. Дзякуючы таму, што з канцом вайны, старые памешчыкі, адвечные „зямельные лёрды“, з каторымі арандатары, кепска ці добра, ужо зжыліся і ад каторых яны з практыкі не чакалі сабе вялікіх неспадзяванак і горшых умоў у справе арэнды,—гэтые памешчыкі посьле вайны сталі шпарка прадаваць свае землі, і земля стала пераходзіць у рукі „новай буржуазіі“, або, лепш сказаць, разбагацеўшай у часе вайны ўсялякай, нядаўна яшчэ цёмнай, публіцы, каторая зараз жа, разумеецца, стала спэкуляваць зямлёю і каторая па сваёй натуры непакоіць арандатара. Апошні, дзякуючы інтэнсыўнасьці ангельскай сельскай гаспадаркі, затраціў на сваю фэрму вялічые кошты і цяжкую працу і павінен надалей рабіць затраты. Яму трэба быць зусім спакойным за сваю будучыну, за свой заўтрашні дзень. Гэтага вымагаюць яго інтарэсы, а гэтак сама інтарэсы краю. Трэба ня толькі захаваць высокі стан свае сельска гаспадарскай культуры, але і разьвіць яе далей.

Як жа адказвае проэкт новага аграрнага закону на гэтые пытаньні? Аб гэтым пагаворым другім разам.

Г. Маркевіч

Чытайце

сваю газэту!

і пашырайце яе

сярод знаемых!

Апошнiе навiны.

Украінскі урад у Праскураве.

ЛЬВОЎ—19—VI. Украінскі урад пераехаў з Жмерынкі ў Праскураў. Некаторые міністэрствы перавезены ў Камянец Падольск.

Хворасьць Вільгэльма.

ПОЛЬДГУ, 21—VI. Бышы імпэратар Вільгэльм цяжка захварэў.

Лёйд-Джордж за аднаўленьне гандлёвых зносін з Расіяй.

ТОРСЭА, 21—VI. Лёйд Джордж будзе настаіваць на аднаўленьні гандлёвых зносін з Расіяй. Італьянскі міністар Сфорца будзе яго падтрымліваць.

Ірляндзкае пытаньне.

ЛЁНДАН. 20—VI Асквіт заявіў, што ірляндзкае пытаньне будзе разрашано толькі ўладжаньнем аўтаномнага ураду ў Ірляндыі.

Зьмяншэньне цэн у Польшчы.

ЛЮБЛІН, 19—VI. Цана на зярно ўпала на 60°/o.

КАЛІШ, 19—VI. Вялізарнае зьмяншэньне цэн на зерневы хлеб.

ЛОДЗЬ, 19—VI. Прыкмячаецца значнае зьмяншэньне цэн на харчовые прадукты першае патрэбы.

Саюз Італіі і Францыі.

Джыёліты паслаў Мільерану тэлеграму з выказаньнем запэўненьня, што саюз Італіі і Францыі, дзякуючы дзеельнасьці урадаў гэтых краёў, умацуецца яшчэ больш.

Пагроза забастоўкі.

НАЎЭН, 19—VI. З прычыны пагрозы пачаць агульную забастоўку, окупацыйная улада у Людвічэсговені прыстрашыла ўвядзеньнем асаднага палажэньня.

Чычэрын і Мустаф Кемаль.

БЭРЛІН, 19—VI. Газэты паведамляюць з Стакгольму, што Чычэрын атрымаў ліст ад Мустаф Кемаля з прапазыцыяй завязаць дыпляматычные і консулярные зносіны з турэцкімі націяналістамі. Чычэрын у сваім адказе згадзіўся на гэта. Газэты дадаюць, што Энвэр Паша, каторы знаходзіцца цяпер у Маскве, меў вялікі ўплыў на бальшавіцкую політыку бліжняга Ўсходу.

Міністэрскі крызыс у Польшчы.

Посьле таго, як Я. Брэйскі прыняў на сябе ўтвараньне габінэту, ён пачаў перегаворы з прадстаўнікамі фракцыяў левых і цэнтра. Вёў Брэйскі перагаворы і з прадстаўнікамі правага крыла і п. п. с.

[Пры] гутарцы з прадстаўнікамі п. п. с. Брэйскі намаляваў ім пляя дзеельнасьці будучага габінэту. У пытаньні аб міры Брэйскі лічыў абавязковым устанаўленьне граніц Польшчы на Ўсходзе. Між іншым, Брэйскі прапанаваў проэкт колёнізацыі Ўсходніх Зямель рээмігрантамі з Амэрыкі.

Фракцыя п. п. с., выслухаўшы прапанаваньні, пачала іх крытыкаваць і вынесла рэзалюцыю, у каторай указвае, што, з прычыны няяснасьці програмы будучага ураду ў пытаньні міру, п. п. с. у урадзе прымаць учасьця ня будуць і выясьняць свае адносіны к ураду ў будучыне.

Посьле адмаўленьня п. п. с. і правых фракцыяў у учасьці ў габінэце Брэйскага, адбылася нарада трох фракцыяў: „Пястоўцаў,“ „Вызваленьня“ і „Народнай рабочай партыі,“ на каторай была ўстаноўлена програма будучага ураду:

1) Захаваньне цяперашняе позыцыі ураду ў заграпічнай політыцы, а асабліва ў пытаньні аб Усходніх Землях і Украіне.

2) Скорае ўтвараньне міру.

3) Прыняцьце проэкту констытуцыі з аднапалатнай сыстэмай.

4) Правядзеньне ў жыцьцё Зямельнай рэформы ад 10 ліпеня 1919 г.

5) Харчовая політыка на аснове контынгэнту, забясьпечваючага патрэбы войскаў, гарадоў і прамысловых прадпрыемстваў.

6) Аднаўленьне прамысловых прадпрыемстваў ва ўсіх галінах.

7) Соцыяльные рэформы.

8) Разьвіцьцё справы асьветы.

9) Роспуск Сойму і зацьверджаньне констытуцыі.

Брэйскі прапанаваў Дашынскаму быць старшынёю будучай міравой дэлегацыі.

Дэпутат Дубановіч, катораму удалося раскідаць пляны левых фракцыяў і не дапусьціць да ўтварэньня цэнтра-левага блёку, ня мог прымірыцца з думкаю, што дэп. Брэйскі пачаў сваю дзеяльнасьць, маючы пэўную програму, заключаючую ў сабе самы горшы для Дубановіча пункт: „захаваньне цяперашняга погляду ў заграпічнай палітыцы“.

Адмаўленьне дэп. Дубановіча прыняць учасьце ў разглядзе програмы ураду прывёў да таго што ўтварэньне новага габінэту пры ўчасьці фракцыі народнага злучэньня зьявілося немагчымым.

У зьвязку з гэтым сталі гаварыць зноў аб утварэньні цэнтра-левага габінэту.

Левые фракцыі пастанавілі, мабыць, спыніць перагаворы з партыяй народнага злучэньня і зрабіць зноў спробы к утварэньню цэнтра-левага блёку. Пэршым крокам у гэтым кірунку было злучанае пасяджэньне, якое адбылося ўчора, прадстаўнікоў сялян. саюзу, П. П. С., групы Стапінскага, Народнай рабочай партыі, а так сама і прадстаўнікоў констытуцыйнай фракцыі

Увечары ў кулуарах Сойму пашлі чуткі, што ўтвараньне габінэту на чале з Брэйскім спаткало вялікіе перашкоды, і пытаньне будзе перагледжано.

19 чэрвеня раніцай адбылося агульнае пасяджэньне фракцыі P. C. L., Вызваленьня, N. P. R., P. P. S. і P. K. P. з мэтай перагавораў аб утварэньні лева-цэнтравай большасьці, як асновы для габінэту Брэйскага.

Посьле нарады ад імя фракцыі P. C. L., Вызваленьня, лявіцы P. S. L., N. P. R. і P. P. S. старшыні Сойму Трампчынскаму была перададзена офіцыяльная заява аб тым, што формаваньне габінэту павінно быць даручано дэп. Вітасу.

Брэйскі пры гэтым запэўніў, што фракцыя P. K. P. дакляруе спагадаючы нэўтралітэт.

Дэп. дэ Росэт, запрошаны Трампчынскім, выказаўся аб позыцыі свае мяшчанскай фракцыі і паведаміў, што яго група нічога ня мае проціў даручэньня гэтай місіі дэп. Вітасу.

У адзінаццаць часоў уночы 19 чэрвеня ў старшыні Сойму Трампчынскага сабраліся прадстаўнікі 5 вышэйназваных фракцыяў.

Старшыня Сойму запрасіў прэзыдыум фракцыяў констытуцыйнае працы Федаровіча і графа Бавароўскага. Федаровіч адказаў, што яго фракцыя ня будзе перашкаджаць утварэньню габінэту Вітаса.

Посьле гэтага старшыня Сойму заявіў, што даложыць аб прынятым рашэньні п. Начальніку Дзяржавы.

Прадстаўнікі соцыялістаў згадзіліся, пры вядомых умовах, прыняць учасьце ў габінэце. Адной з аснаўных умоваў соцыялістаў зьяўляецца—мець уплыў на міністэрство заграпічных спраў.

З Варшавы тэлеграфуюць ад 20 чэрвеня: Дэпутат Брэйскі паведаміў Начальніка Дзяржавы, што перадпарлямэнц. фракцыі P. P. S., P. S. L., Вызваленьне, P. L. S., лявіца N. R. P. прызналі для сябе магчымым утварэньне ураду. На чале яго стане Вітас. Начальнік Дзяржавы ўтвараньне новага габінэту даручыў Вітасу.

Перагаворы з бальшавікамі.

Нота саюзьнікаў Красіну.

Тэлеграма з Лёндану паведамляе, што саюзьнікі перадалі Красіну ноту, ў каторай выказваюць жаданьне адтрымаць гарантыі аб забясьпечаньні купцоў, якіе едуць у Расію, і уплаты за купленые расійцкамі тавары. Саюзьнікі вымагаюць дэтальнае дэклерацыі ў пытаньні аб умовах будучых гандлёвых опэрацыяў.

Красін у вышэйшай радзе.

Радыё з Парыжу паведамляе, што Красін быў прыняты першы раз вышэйшай гаспадарчай радай саюзьнікаў. Спатканьне было вельмі нядоўгае. Разгладаліся толькі формальные пытаньні.

Амэрыка была запрошана прыняць учасьце ў перагаворах.

У ніжняй палаце Лёйд-Джордж, адказваючы на зробленае лёрдам Керзонам запытаньне, сказаў, што амэрыканскі урад быў запрошан прыняць учасьце ў вядзеньні перагавораў з Красіным, але да гэтага часу ад яго няма адказу.

Начальнік Дзяржавы аб міры з Расіяй.

У „Daily Express“ зьмешчана гутарка дапісчыка газэты з маршалам Пілсудзкім.

Начальнік Дзяржавы сказаў, што Польшча гатова ўтварыць мір, але ня мае ніякіх гарантыяў, што Расія не нарушыць сваіх абавязкаў.

Расія політычна ня істнуе, а з гэтае прычыны ня можа даць ніякіх гарантыяў.

На просьбу выказаць погляд аб перагаворах з Красіным, Начальнік Дзяржавы адказаў: „Хто вядзе перагаворы з Расіяй, той ня ведае Расіі.“

Ліга народаў і польска-расійская вайна.

Ліга барацьбы з вайною запатрабавала ад Лёйд-Джорджа, каб Ліга народаў мела ў патрэбнай меры вайсковые і марскіе сіл, каторые далі б магчымасьць Лізе Народаў праводзіць свае пастановы ў тых выпадках, калі хто з урадаў залежных краёў запрацівіцца яе пастановам. Лёйд-Джордж

Мініятуры.

Гімны.

Цішыня паўночная.

Багата думак кажаш жывой душы чалавека. Ты апавядаеш аб тых сівых часох прадтварэньня, калі яшчэ безкшталтные хаосы блукалі вольна ўсюды.

Ты—адсьвет, цень-успамін далёкай мінуўшчыны. Душа ўглядаецца ў цябе, як у люстро. Ён успамінаец ца крыніца невядомасьцяў, скуль яна выплыла на верх

* * *

Душа шукае.

Ці толькі адным шуканьнем корміцца яна?

Ніхто адказу не дае. Толькі таемны голас гавора:

Адважна пераступай мяжу дабра і зла на зямлі, бо адну і тую самую рэч некаторые завуць „дабром“, а некаторые—„злом.“

А ты ідзі па шляху Волі Вялікай. Пажарышчо творчасьці будзе табе сьвяціць, нібы сямісьветнае сонцо.

Руйнуй муры струхлеўшых людзкіх пераконаньняў. На папялішчах будуй новае жыцьцё.

* * *

Ты магутны, творчасьці дух! У межах тваіх—віхор і полымя. Пад скрыдламі тваімі—скарб будучыны. Ты будзеш большым, чым ты ёсьць цяпер. Перад тваім вялікім сьветам сонцо ценьню выглядае. Табе толькі здаецца, што прыкованы навекі да скалы, але ты вольны, як сам Бог Гасподзь.

* * *

Цябе варожаць велічы ўсясьветнасьці:

Нібы казачные арлы, лунаюць плянэты ў хвалях бязмежнага, вазлушнага мора.

Якой дарогай кіруюцца яны? Хто іх кліча і куды яны так сьпяшаць?

А яны табе здаюцца залатымі пчолкамі на блакітных нябесных абшарах. Цябе вабіць хараство адвечнасьці.

Перад гэтым хараством хараство зямлі ёсьць адбітак сонца ў лужыне вады.

* * *

Ты глядзіш на ўсясьветнасьць зблізку і здалёку, і ад гордасьці, што ты частка яе, ты сумнявацца пачынаеш:

Хто выдумаў малітвы?
Каму яны патрэбны?
Ці не ўніжаюць яны Тварыцеля?

Страшны ты ў буры сумненьня, ў пякельні бунту, ў чорных вопратках смутку.

Ты—ты грыс пустэльні, сокал гор. Ты ляціш. Над табою—процьмы глыбокіе. Гэта завецца жыцьцём.

* * *

Жыцьцё—ў творчасьці.

А нехта моцны бьецца ў гмахі тваіх думак. Заходзіць няпрошаны ў тваю сьвятыню і гаворыць словы жудасьные, як прарок гібелі, як бязлітасны бацька страху;

— Ты нічога ня творыш. Ты перамалёўваеш чужы абраз. Ты чытаеш гэрогліфы, пісаные чужою рукой. Ты старые песьні перапяваеш. Новых пуцявін няма ў цябе.

Гэтые словы адымаюць твой супакой. Яны кайданамі закоўваюць тваё сэрцо, якое крывёй абліваецца.

Ты думаеш, што заблудзіўся, і пачынаеш нанова шукаць...

Ты шукаеш выйсьце ад волі чужой.

А можа само шуканьне ёсьць чужая воля? Можа гэта загад маці жыцьця? Мо гэта ёсьць зачараваны круг адвечнасьці?

* * *

Адвечнасьць—шмат-галовая гідра. Халодным агнём атуляе яна ўсё... І ты толькі пераліваеш старае віно ў новые бочкі.

Вось і вялікая праўда глядзіць на цябе сваім грозным вокам. Ты яе пазнаў. Ты шчасьліў, што пакаштаваў з дрэва пазнаньня. Ты няшчасьліў, што цело сваё затуляеш лісьцямі фігавымі.

* * *

Ня хочаш жыць, але жыві, бо няма сьмерці.

І дух творчасьці ляціць агністым мэтэорам па абшарынах. Ён праводзіць залатую дарогу да млечнага шляху. Ён—частка бязсьмерцьця. Ён забываецца аб драбніцах будзённага жыцьця і прыслухоўваецца да песьняў сонца ў дзень і да малітваў зорак уночы.

Замчышчо.

Зажадалася людзям жыць вальготней—і давай будаваць высокае замчышчо. Чым глыбей капалі зямлю навакол, тым вышэй расло замчышчо.

Яно горда падымалася ўверх, ўсё вышэй і вышэй, нібы хацело надзець сонцо на сябе, як карону.

І людзі зьверху пачалі кідаць у ніз каменьні.

Прымушаны былі людзі ўнізе жыць у тых глыбокіх ямінах, што самі выкапалі: яны самі адышлі ад сонца да цемры.

Так ішло пакаленьне за пакаленьнем. Людзі думалі, што гатак трэба жыць. А калі маладые хацелі часам лезьці наверх, дык старые пужалі іх—ня лезьці на пэўную сьмерць.

А людзі перасталі баяцца сьмерці і пачалі карабкацца з процьмы. Сыпаліся на іх з вышкі замчышча каменьні, каторые забівалі соткі людзей.

На касьцёх братоў сваіх людзі падымаліся з процьмы і ўгледзелі кавалачак неба і тады толькі даведаліся аб тым, як у іх цёмна...

Пры гэтым замчышчо рабілося ўсё ніжэй, бо зрывалі з яе каменьні, каб забіваць людзей.

Ішло змаганьне за сонцо, за шчасьце. Шмат лілося крыві.

Ці пасачаць людзі сонцо? Ці дойдуць яны да вышыні шчасьця?

За праўду.

За тое, што чалавек гаварыў праўду, людзі адрэзалі яму язык. Чалавек анямеў. Але ён добра ўсё бачыў і чуў, што рабілі людзі навакол і пасьля гэтага, і не даваў ім супакою сваімі крыкамі бяз слоў аб тых няпраўдах, што яны чынілі.

Людзі выкалалі яму вочы. Чалавек асьлеп. Але вушамі сваімі ён добра чуў, дзе што дзеелася і, ўзяўшы ліру ў рукі, ён ім зайграў песьню аб праўдзе, такую адважную і гнеўную песьню, што аж людзей страхоцьце прабрало.

Людзі адрэзалі чалавеку рукі, каб ён ня мог будзіць іх сумленьня сваімі песьнямі. Але чалавек і пасьля гэтага не супакоіўся: Дзе толькі здаралася якое злачынство, ён там стаяў нямым сьведкам, паламаным, пакалечаным крыжам, і відам сваім напамінаў ім аб праўдзе.

Людзі забілі чалавека. На яго акрываўлены труп накінулі крушню каменьнеў. Але кожны раз, як толькі праходзілі каля гэтай крушні, яны ўспаміналі аб гэтым чалавеку і аб праўдзе...

Людзі раскінулі каменьні па дзікіх палёх, а труп спалілі на агні, каб і знаку ад яго не асталося. Але яны не маглі ўціхамірыць тэй буры, што чалавек выклікаў у іх душах... Непакой у іх сэрцах рос.

адказаў, што Расія і Польшча, напрыклад, маюць кожная па поў-мільёну, ці навет 750 000 войска. Ці-ж дзеля гэтага Ліга Народаў павінна мець на гатове сілы для выступленьня проціў гэтых арміяў? Калі і як можна стварыць такіе контр арміі?

Што тычыцца інтэрвэнцыі ў Расіі, дык тая навет адкінула пропазыцыю прыняць дэлегацыю Лігі Народаў, а што тычыцца Польшчы, дык ёй зрабілі пропазыцыю, але эканаміцкі націск, прадвідзены статутам Лігі Народаў, можа даказаць, што Польшча ня мае рацыі на гета.

Політычные весткі.

Конфэрэнцыя ў Спаа.

„Daily telegraph" піша, што ў дыплёматычных кругох заўважаюць, што конфэрэнцыя ў Спаа будзе толькі конфэрэнцыяй Францыі і Англіі з аднаго боку і Нямеччынай—з другога.

Немцы учынілі шкоды на 200 мільярдаў фр.

Сэнатар Гафаэль Левы, член францускага інстытуту, вылічыў шкоды, якіе немцы учынілі розным руйнававаньнямі на 200 мільярдаў франкаў.

Аб польска-расійскай вайне.

„Daily Mail" абурываецца, што саюзьнікі ня могуць спыніць польска-расійскага конфлікту. Газэта кажа, што погляд аб тым, нібы саюзьнікі ня могуць стрымаць праліцьця крыві ёсьць абсурд.

Вольны горад Гданск.

15 чэрвеня адбылося першае паседжэньня установчага сойму вольнага гораду Гданску.

Рэвалюцыя ў Албаніі.

„Matin" даведваецца з Рыму, што ў ва ўсей Албаніі выбухнула рэвалюцыя, маючая мэтай скінуць албанскі урад, тэрорызуючы насяленьне і пад трымліваемы Італіяй.

Італьянцы пакідаюць Чарнагорыю.

„Temps" паведамляе з Рыму, што паводлуг вестак з Валёну, італьянскіе аддзелы пакідаюць тэрыторыю Чарнагорыі. У Трыесьце адбыліся бурные манифэстацыі з мэтай выказываньня протэсту проціў высыланьня войска ў Албанію.

Пераварот у паўночнай Пэрсыі.

Індускіе войскі адмовіліся ваяваць проці пэрсыдзкіх рэвалюцыянэраў, і дывізія пэрсыдзкіх казакаў перайшла на бок рэвалюцыянэраў.

Урэшце, арганізаваўся часовы урад з Кучыкфонам на чале. Кучыкфон з'арганізаваў нацыянальнае паўстаньне ўТаўрыдзе.

Японія вяртае Кітаю Кіао-Чао.

Нямэцкіе газэты даведаліся аб ноце Японіі Кітаю, у каторай Японія выказывае гатоўнасьць вярнуць яму Кіао-Чао.

На Каўказе.

„Echo de Paris" паведамляе: Пераміріе між Грузіяй і Азэрбэйджанам перэрвано і вайсковые опэрацыі аднавіліся. Грузіны кепска ўзброены і ня будуць мець магчымасьці доўга весьці барацьбу. У Азэрбэйджане знаходзіцца 50 тысяч савецкіх войскаў. Гэта армія мае намер цераз Армэнію дайці да Батуму і абкружыць такім чынам Тыфліс.

Зьмяншэньне быдла на Беларусі.

Ведамасьці аб зьмяншэньні быдла на Беларусі, подлуг паведамленьня Статыстычнага Аддзелу Ц-эв. Упраўленьня „Усходніх Зямель", паказаных на зьезьдзе праўнікаў і эканамістаў у Варшаве. Справу зьмяншэньня быдла ў *Менскім округе* ілюструе гэтакая табліца:

Паветы.	На кілём		На 1000 жыхароў.		% зьмяншэньня быдла.
	1910 г.	1919 г.	1910 г.	1919 г.	
Менскі	11,00	7,36	179,43	125,97	33,09
Ігуменскі	7,42	3,75	231,49	74,00	48,11
Барысаўскі	7,04	3,58	221,85	163,00	63,35
Слуцкі	15,59	11,70	366,73	351,86	24,96
Бабруйскі	11,37	4,75	394,00	247,62	60,86
Сярэднее	10,50	5,75	278,08	192,68	45,24

Рэзультаты, паказаные вышэй, варта параўнаць з данными Польшчы, каторая так сама як і Меншчына была окупавана і была полем руйнуючых бітваў.

На падставе матар'ялаў Статыстычнага Аддзелу Z. C. Z. W. колькасьць быдла ў 1919 г. у Польшчы ілюструецца гэтак:

		на 1000 жыхароў.
Ваяводзт.	Варшаўскае	137,03 штук
„	Лодзінскае	151,15 „
„	Келецкае	171,08 „
„	Люблінскае	158,71 „
„	Беластоцкае	132,28 „
Сярэднее		150,05 штук

Калі возьмем статыстыч. данные перадваенные, напрыкл, тые, якіе знаходзяцца ў „Roczniku Polskim" Ромэра і Вэльфэльда на стр. 55, то ўбачым, што колькасьць быдла ў 1912 г. вызначалася ва ўсёй Польшчы--150 штук на 1000 жыхароў, амаль столькі, як і ў 1919 г.. Паводлуг таго-ж „Rocznika Polskiego", працэнтная колькасьць быдла для губэрніяў: Віленскай, Горадзенскай і Менскай у 1912 г. вызначалася ў 1912 г. 345, а ў годзе 1919, ужо ледзьве 154. Гэта ёсьць рэзультат розьніцы, якая панавала між політыкай Ober-Ost'u i Zivilverwaltung Warschau.

Округ Берасьцейскі. Як убачым з ніжэй зьмешчанай табліцы, зьмяншэньне рагатага быдла ў Берасьцейскім округе ёсьць для некаторых паветаў катастрофічным.

Зьмяншэньне гэтае прадстаўляецца вось у гэткіх цыфрах:

Паветы.	На кілём		На 1000 жыхароў.		% зьмяншэньня быдла.
	1906 г.	1920 г.	1906 г.	1920 г	
Берасьцейскі.	12,37	1,22	284 90	70,63	90,13
Ваўкавыскі	11,92	3,15	255,46	114,08	73,57
Кобрынскі	16,87	2,73	455,62	123,19	83,81
Пружанскі	10,70	1,31	299,06	68,82	87,75
Пінскі.	9,11	4,21	344,33	205,41	53,78
Слонімскі	12,15	0,47	408,44	24,67	96,13
Барановіцкі	13,58	8,36	270,52	262,62	38,43
Мазырскі	8,13	3,57	515,00	240.47	56 08
Сярэднее	9,33	3,29	297,14	166,30	64,73

Для году сярэдняга між 1906 і 1920 г., а найбольш для 1912 г., маем агульные данье для Горадзенскай губэрні ў „Roczniku Polskim". Прымаючы пад увагу што большая часьць зямлі даўнейшай Горадзенскай губэрні увайшла у склад Берасьцейскага округу, цераз гэта рэзультаты параўнаньня гэтых дзьвёх адміністрацыйных адзінак не вельмі розьніцца ў праўдзе.

Рэзультат больш-менш будзе прадстаўляцца гэтакі:

У 1906 г. 9 штук быдла на кв. кілём.
„ 1912 г. 12 „ „ „ „ „
„ 1920 г. 3 „ „ „ „ „

Упараўнаньні да 1912 г., колькасьць рагатага быдла на кв. кілем. у 1920 г. зьменшылася на 75%.

Заслужвае ўвагі павет Баранавіцкі, які розьніцца большай колькасьцю быдла. Як ведама, сялянэ гэтага павету скарысталі з ліквідацыі расійскага фронту.

Беларуская кроніка.

Ад Прэс-Бюро Бел. Вайск. Камісіі.

У № I віленскай часопісі „Незалежная Думка" надрукована корэспондэнцыя з Менску „Аб беларускім войску", падпісаная: „Менчук". Аўтор гэтай корэспондэнцыі, указваючы на „прычыны, перашкаджаючые формаваньню беларускага войска", між інш. робіць закіды Беларускай Вайсковай Камісіі, што яна „прасявае праз вузкае сіто кожнага жадаючага паступіць у беларускае войско".

У адказ на гэта, Беларуская Вайсковай Камісія высьвяе, што гэтакае „сіто" лічыць яна канечна патрэбным дзеля таго, каб у беларускае войско не папалі чужацкіе, ваража настроенные да беларускасьці элементы. Бел. Вайск. Кам. стаіць на тым поглядзе, што для нашай беларускай справы важней моральная вартасьць і нацыянальная сьвядомасьць жаўнера, чымсь яго колькасьць. Само сабой разумеецца, што і пабудованые на гэтым закідзе вывады, якіе далей робіць аўтор корэспондэнцыі,—абмылковы і маюць на мэце толькі хіба абніжыць у вачох грамадзянства павагу Бел. Вайск. Кам., аб чым яшчэ сьведчыць і агульны непрыязны тон усяе корэспондэнцыі.

Беларуская Вайсковая Камісія вядзе сваю працу з поўным зразуменьнем той вялізнай адказнасьці, якая ляжыць на ёй перад грамадзянствам, і адзначае, што падобные да памянёнай корэспондэнцыі ў беларускіх часопісях закіды ня толькі не памагаюць узмацаваць і пашырыць тую вялікую агульную справу, да правядзеньня якой у жыцьцё прызвана Беларуская Вайсковая Камісія, а навет робяць шкодную работу.

Менскае жыцьце.

У 25-ю гадаўшчыну духоўнай дзейнасьці р.-к. біскупа Лазінскага 23 га чэрвеня, ў катэдральным і іншых касьцёлах места адбудзеца урачыстая імша.

Увечары адбудзеца ушанаваньне біскупа рознымі грамадзянскімі арганізацыямі.

Сход камітэту ушанаваньня дваццаціпяцігадовай гадаўшчыны пастырства кс. біскупа Лазінскага адбудзецца ў аўторак а 5 гадзіе 30 мінут па паўдні ў будынку Польскай Рады зямлі Менскай.

Протэст. „Настаўнікі беларускіх, жыдоўскіх і расійскіх школ далучаюцца да протэсту служачых магісарату м. Менску проціў дзеяньняў п. бурмістра Доўнар Запольскага на падставе фактаў, якіе адзначаны ў лісьце служачых, зьмешчанам у № 258 Гонца Мінскага".

І праклінали людзі памяць чалавека за тое, што ён сумленьне іх чапаў. Праклінаючы яго імя, яны гэтым самым увекавечылі яго змаганьне за праўду.

Хто стаіць за праўду, той ніколі згінуць ня можа.

У жыцьцёвым змаганьні.

Дробненькая мурашка ўзваліла на свае плечы ветачку ў дваццаць разоў большую за сябе. Гэту ветку ёй трэба было з ямінкі занесьці ў муравельнік.

Каб чалавек ступіў нагой, дык закрыў бы гэту ямінку з мурашнікам разам. Але мурашцы яна здавалася вялікай процьмай, ад якой галава кружылася і вочы мутвелі. Яна карабкалася патроху ўверх.

Гэта было ўсё роўна, як-бы чалавеку трэба было цягаць на вялікую гару цэлую сасну.

Ня дай Бог зьляцець уніз з гэткай махіняй—можна сабе і карк зламаць, і душою згінуць.

Мурашка трымалася цьвёрда, але ня вытрывала—здарылася няшчасьце, і яна разам з махіняй пакацілася ўніз. Яна моцна пабілася, паранілася, наглыталася пылу і, як нежывая ляжала ў глыбі яміны, прыціснутая веткай. Здаецца, апошніе мінуты яе насталі...

Але праца не цярпела адкладу, пяшчоты і гультайства. Мурашка выбралася як кольвечы з пад галінкі, расплюсвула вочы, адтраслася і, урэпіўшыся зубамі ў махіню, зноў лезла на гару.

Разоў дваццаць здарылася з ёю тое самае няшчасьце. Некалькі яшчэ крокаў, і яна была-бы на месьце, але дмухне ветрык і яна зноў ляціць, як пылінка ў процьму.

Пот пакрыў яе. Цело было ў крывавых ранах. Яна цяжка дышала. Але ў вачох гарэў агонь вялікай церпялівасьці і ўпартасьці. Дух вялікага асілка жыў у яе грудзях.

І вось у дваццаць першы раз пусьцілася яна наверх памаленьку, асьцярожна, абмінаючы апасные месцы і няроўнасьці на цяжкім шляху. Вочы яе ўпіліся са смагай у даль. Лапкі яе працавалі і працавалі. Бокам скокам, і яна з трыумфам дабралася да муравельніка з патрэбнай галінай.

Яна выпаўніла страшэнна цяжкую працу на агульную карысьць свайго племені бяз ніякага шуму, бяз ніякіх пахвал, як свой натуральны жыцьцёвы абавязак.

Кволые кветкі.

Кволые кветкі вясны маей завялі без пары, і душу маю атуліў халодны туман тугі. Пажарышчо майго сэрца зьнікло, як вядзьмарскі балотны агонь. Белым лебедзем уняслыся мае мары, і я перастаў верыць у лепшае жыцьцё.

. . . .

Хтосьці пяяў пад маім вакном сумную песьню глыбокай мінуўшчыны. Нібы птушка за птушкай, нібы зорка за зоркай, лунала мэлёдыя, і я ня мог заснуць. Зажадаў я, каб песьня сьціхла, каб яна ня будзіла маё сэрцо, каб яна не гаварыла мне аб нечым лепшым і сьвятлейшым, каб ня выклікала ўспамінаў.

Перарвалася песьня. Зыкі яе шчэзьлі, нібы човен рыбака ў далечы рэчкі. Рабіна шаптала за вакном, галінамі сваімі ў шыбіны б'ючы. Потым ветрык сьціх, і настала цішыня. І я ўсё роўна ня мог заснуць. Зажадаў я зноў песьню наслухаць, зажадаў я зноў луваць душой над яе мядовымі хвалямі ў поўначы, але яна не паўтаралася. Песьня змоўкла. І толькі тады, як яна змоўкла, я зразумеў яе сілу...

Надыходзяць змрокі...

Надыходзяць змрокі. Зарніца над горкай паміраe. Цені атуляюць увесь абшар. Над млынам і возерам падымаецца густы туман. Робіцца ціха ў ваколіцы. Нямее ўся зямелька, як-бы прыслухоўваецца да няясных зыкаў ночы.

Надыходзяць змрокі. Разам з імі падымаецца і расьце мой смутак. Разам з таёмнымі зыкамі ночы, разам са стогнам блізкай пушчы, ён будзіць маё сэрцо.

Нібы пажарышчо, месяц вырываецца з пад хмар. І абраз, выгадаваны ў маей душы з маленства, устае ва ўсей красе сваей. Як хмель мядовы, ён ап'яняе мае думкі.

На палатне маляра я бачыў яго ўсьмешку. На белым камені я бачыў яго дзіўна-прыгожую постаць. Ён гаварыў мне аб шчасьці са струн ліры...

Расьце мой смутак, нібы вогнішчо рыбакоў ля рэчкі, і душа мая рвецца да малітвы. Яна кажа малітву бяз слоў. Гэткую малітву кажуць і бярозкі пад ветрам паўночным, і краскі ў расіцы бліскучай, і рэчка між сьценамі шопатнага сітніку, і ўвесь Божы сьвет пад шатамі летней ночы...

Пад песьней салоўкі.

Над сажалкай люстэрнай, між цьвітучым вішняком, салоўка пеў. Спала зямелька вясновая пад паўночным зьяньнем месяца. Зоркі ў небе бліщчэлі буйные і бліскучые.

Спаў і я, толькі сэрцо маё ня спало. Сэрцо марыло аб тэй, каторая яго запаланіла, каторая іграла на маім сэрцы, як на арфе...

Песьні майго сэрца былі вясновые, сонечные, як песьні салаўя. Сьвет Божы выглядаў у іх такім харошым і шчыра-радасным, як само сонцо. Жыцьцё ў гэтых песьнях малявалася фарбамі кветак. І было яно чыстае, як крынічная вада.

А кончыў салоўка сваю песьню, мінула вясна, кончыліся песьні майго сэрца—мінула вясна і для яго. А дзяўчынка пайшла ў нябыт, пакінуўшы мне толькі недасьціглую мару.

Яшчэ раз прыдзе вясна, яшчэ раз салоўка запяе, але сэрцо маё болей не адклікнецца на гэтые чары, як раней, бо яго вясна мінула назаўсёды...

Хаўтуры.

Закруціў бязьлітасны вецер-віхор і вырваў з-пад страхі хаты палясоўшчыка ластаўчыно гняздо. Гняздо ўпало не на мяккую зямельку, а на цьвёрдые, вострые каменьні. Гняздо было ня пустое,—у ім была сям'я маленечкіх, кволенькіх ластавачак, каторые афарбавалі каменьні сваёй крывёй.

Кружылася над імі маці няшчасная і горка плакала-стагнала. Ударыцца скрыдлачкамі аб халодную зямлю, прыпадзе грудзьмі белымі да дзетачак забітых, зноў узьляціць са скаргай да неба—і супакою знайсьці не магла.

— На каго-ж вы мяне пакінулі, дзетачкі мае?—галасіла бедная маці. А на што-ж я вас выседзела—вынянчыла, сама ня еўшы, ня піўшы? А на што-ж я ад зары да зары насіла вам рабачкоў і мушачак на кармежачку? А каго-ж я буду грэць пад скрыдлачкамі матчынымі ў начные халады? А я радасьць-шчасьцейко сваё страціла-згубіла...

Б'ецца аб каменьні акрываўленые маці няшчасная, і грудзі яе рвуцца ад болі.

— А ніколі я вашых сьпеванькаў болей не пачую; а ніколі вы сьвету-сонейка не пабачыце. А бяз родных дзетак сваіх прыйдзецца мне на зіму ў цёплы край ляцець.

Слово ў слово чула гэтые прычытаньні маткі-птушкі малая дачушка старога палясоўшчыка.

Плачучы над горам ластаўкі, яна выкапала магілку на мяжы і пахавала малых птушачак.

Кружылася маці няшчасная над магілкаю дзетак родных і жальбы яе няслыіся ў небо блакітнае.

З. Бядуля.

Кватэрная коопэрацыя. На пасяджэньні ініцыятыўнай групы арганізацыі кватэрнай коопэрацыі было пастаноўлена завязаць зносіны з усімі профэсыянальнымі саюзамі. З гэтай мэтай выбрана сэкцыя пры кватэрным саюзе, якая павінна апрацаваць статут дзеля завязаньня зносінаў з памянёнымі арганізацыямі.

На зьезд паўнамоцных польскага саюзу спажыўчых таварыстваў у Варшаве прадстаўніком ад Цэвтрабелсаюзу выезджае член праўленьня п. Беднаровіч, каторы там аднача сна закупіць для сельскіх коопэратываў вялікую партыю колёніяльных тавараў.

Аддзелы сельскай гаспадаркі пры павятовых старастах пачалі тэрмінова апрацоўваць матар'ялы аб прыватнай земляўласнасьці ўсіх катэгорыяў, а так сама дзяржаўных зямель. Гэта павінна быць зроблена да 25-га чэрвеня.

Гэтымі цыфравымі спраўкамі маюць кіравацца пры будучым аграрным законе.

У Пушкінскай бібліатэцы на апошнім сходзе членаў 17 га чэрвеня было пастаноўлена зьвярнуцца праз друк да грамадзянства з просьбай, каб падпісчыкі шанавалі кнігі і каб іх доўга ня трымалі. Пастаноўлена так сама выпісаць новые кнігі.

У скарбовай палаце некаторым служачым, дзеля палепшаньня іх матар'яльнага становішча, выплачываецца цяпер пэнсія авансам аж па верасень месяц.

У саюзе злучаных коопэратываў ва ўсіх 13 крамах маюць быць зьменшаны штаты служачых.

У „Земкоопэратыве" 27-га чэрвеня адбудзеца агульны сход пайшчыкаў, дзеля разгляду розных чарговых пытаньняў.

На начлежны дом для польскага жаўнера ў Бабруйску сабралі з фантавай лётарэі 4991 марку.

Рэзаць цялят дазволена **на ўсей** тэрыторыі Менскага Округу.

Шасьцітыднёвые курсы польскай мовы для настаўнікаў Менскага павету адчыняюцца 1-го ліпня.

На рынку ўчора сталі вось якіе цэны: хлеб—6½ м. фунт, сало—65 м. ф., каўбаса—35 м. ф., сыр—15 м. ф., яйкі—25 м. дзесятак, сьмятана—30 м. кварта, малако—5 м. кв., дровы—300 м. возік, масло—60 м. ф., мясо—30 м., ніткі—60 м. шпулька.

На біржы ўчора давалі:

за	500 руб. цар.	1370	польск. мар.
„	1000 руб. дум.	612	„ „
„	100 мар. ням.	420	„ „
„	1 франк	11	„ „
„	1 фунт. ст.	670	„ „
„	1 доляр	155	„ „

Апошнімі днямі прыкмячаецца запатрабаваньне на польскіе маркі (пяцісоткі).

Допісы

З Случчыны.

Слухачамі курсаў беларусазнаўства ў Слуцку заложан Беларускі Вучыцельскі коопэратыў, які згуртаваў каля сябе ўсё вучыцельство павету. Апроч спажыўнасьці, коопэратыў будзе мець шырокую беларускую кнігарню з усялякімі пісьменнымі прыладамі, а так сама вучыцельскі дом з бібліятэкай-чытальняй і сталоўняй. Дзеля прывучэньня школьнай моладзі да коопэратыўнай працы выказано агульнае пажаданьне заснаваць пры школах дзіцячые коопэратывы пад наглядам коопэратыва вучыцельскага. У гэтым кірунку урад коопэратыва пачынае рабіць патрэбные крокі. Урад мае на мэце разьвіцьцё шырокай сеці дзіцячых тэатраў, садоў, пляцоўак і інш. Адным з важных заданьняў коопэратыва—зрабіць вучыцельскіе коопэратыўные курсы. Урад коопэратыва складаецца з беларускіх вучыцялёў—сьвядомых коопэратыўных дзеячоў. Шкада толькі, што зараз шырока разьвіць дзейнасьць коопэратыву нельга, за недахватам капіталу. Трэба, каб вышэйшые Беларускіе Ўстановы падтрымалі гэтые добрые пачаткі эканамічнага і культурнага руху паміж беларускім вучыцельствам і па магчымасьці акрэдытавалі часова коопэратыў грашыма.

На апошнім пасяджэньні сяброў Беларускага Нацыянальнага Камітэту Случчыны Камітэт быў падзелен на аддзелы — Адміністрацыйна-Арганізацыйны з Юрысконсульскім Бюро, Школьны, Эканаміцкі і Аддзел дапамогі бедным жыхаром і дзецям. Кожным аддзелам кіруе адзін з сяброў прэзыдыуму па спэцыяльнасьці. Утворана асобная тэатральная камісія, якая цяпер вядзе рэгістрацыю лепшых тэатральных сіл Слуцку. Дзеля наладжаньня тэатральнай справы, магчыма, што ў хуткім часе выедзе ў Слуцак п. Галубок.—

А. Б.

Літэратура і жыцьцё.

„Рунь". Вышла з друку № 7—8. Зьмест нумару такі:

Тэкст: 1) Проф. Е. Карскі—Ян Чачот. 2) А. Гарун—Кліч. 3) Я. Сявец—Вечар вясеньні... 4) Дзяргач—Абразкі з жыцьця Палесься. 5) Краўпоў Макар Не для мяне. 6) Янка Купала—Прымакі. 7) Янка Купала — Князь. 8) Проф. Е. Карскі — Купальле на Беларусі. 9) Язакар—Купальская. 10) У. Ігнатоўскі — Каротkі гістарычны нарыс Гарадзеншчыны. 11) Ф. Аляхновіч—Тэатр на вёсцы.

Малюнкі: 1) Ян Чачот. 2) Капліца на могілках у Ашмяншчыне. 3) Слуцкі культурна-прасьветны гурток „Папараць-Кветка". 4) На р. Прыпеці. 5) Слуцкіе тыпы.

Тэкст на вокладцы: 1) Бібліяграфія. 2) Тэатр і музыка.

Цана нумару 10 марак.

Рэдактар—Я. ЛЁСІК.

Выдавец—К. ТАРЭШЧАНКА.

КИНЕМАТОГРАФ
„МОДЕРН"
Францишканская ул.

КИНЕМАТОГРАФ
„ИЛЛЮЗИОН"
Мицкевича ул.

СЕГДАНЯ ПЕРВАЯ СЕРИЯ
„Клуб Желтаго Треугольника."
Грандиознейшая драма в 4-х сериях 24-х частях 8000 метров.

Борьба женщин
или Триумф Счастья драма в 5 частях.
Сверх программы АВТОМОБИЛЬНЫЕ ГОНКИ В ПАРЫЖЕ.

ПЕРВАЯ РУССКАЯ ХЛЕБОПЕКАРНЯ
С. О. Мигуцкаго и Ко бывш. Штакеля.
Минск, Ново-Московский пер. д. Залкинда прот. № 4.
ПРИНИМАЕТ ЗАКАЗЫ. ПОДРЯДЫ от войсковых частей, учреждений и кооперативов на выпечку ХЛЕБА и БУЛОК. Там же розничная продажа хлеба
ЦЕНЫ и КАЧЕСТВО ХЛЕБА ВНЕ КОНКУРРЕНЦИИ 302.

ГДЗЕ ВЕСЕЛА І ВАЛЬГОТНА ПАСЯДЗЕЦЬ?
ПЭЎНЯ Ж У РЭСТАРАНЕ ПАВІЛЬЁНЕ
НА ГАРАДЗКІМ СКВЕРЫ.
У цяні дрэў, пад шатамі пахучага бэзу можна
Смачна пасьнедаць,
Сытна паабедаць,
добра павячэраць.
Зыкі чаруючага аркестру песьцяць слух.
ПАХУЧАЯ ГЭРБАТА, СМАЧНАЯ КАВА, НАТУРАЛЬНАЯ ЧАКАЛЯДА І КАКАО.
Размаітые закускі Найлепшые трункі. Найлепшая правізія.
ТАННА, ПРЫТУЛЬНА, ВЕСЕЛА. 407

МИНСКАЯ ФЕЛЬДШЕРСКО-АКУШЕРСКАЯ ШКОЛА
ул. Мицкевича (Захарьевская) 31 кв. 4.
Открыт прием на годичный курс акушерскаго отделения 2-го разряда.
ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЙ ЦЕНЗ НЕ ОБЯЗАТЕЛЕН.
Плата для акушерскаго отделения понижена.
Прошения и справки от 11 до 1 ч. дня. 282.

Прымаюцца хутры на летняе пераховываньне.
КУПЛЯЕМ УСЯЛЯКІЕ ХУТРЫ,
ПЛАЦІМ НАЙЛЕПШЫЕ ЦЭНЫ.
СКЛАД ХУТРАЎ Г. Офэнгэндэн і Х. Яноускі,
Францішканская (Губэрнатарская) № 1, дом готэль Эўропа. 216
Прымаюцца хутры на летняе пераховываньне.
Першыукі! Першыукі!

Саюз Злучаных Коопэратываў.
Праўленьне (Катэдральны пляц, д. № 2, б. Іоллеса) падае да ведаму пайшчыкаў і грамадзян, што ва ўсе 13 крам коопэратыву з 16 г. м. штодня дастаўляецца хлеб для прадажы.
Хлеб пячэцца ва ўласнай пякарні. (Тарасаўская д. Мэрголіза) і прыгатаўляецца з чыстай жытняй мукі (бяз ніякіх дамешак) у гігіенічна абстаўленым памяшканьні. 428

У коопэратыве „ЗЛУЧНАСЬЦЬ"
ПРАДАЮЦЦА ВОСЬ ЯКІЕ КНІГІ:
1. Беларускі слоўнік—*Насовіча.*
2. Этнаграфічные зборнікі—*Шэйна.*
3. Беларусы-Сакуны—*Сербава.* 425

—)Выдавецкіаддзел(—
БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЬНАЙ РАДЫ
знаходзіцца па Койданаускай вул. № 21, кв. 4.
Чыннасьць ад 9—3 гадз. 423

Агульная малочная
Дамініканская 3.
мае сьвежае аналізаванае працэджанае праз фільтр-Уляндэра малако і інш. малочные прадукты. 417

Язэп Зальцман Зборавая (Прабраж.) № 15.
КАНТОРА АБМЕНУ ВАЛЮТ
купля і прадажа працэнтных папераў. 413

Покупаю по высокой цене
старинные вещи
картины, гравюры, миниатюры, гобелены, ковры, фарфор, платиновые монеты, стекло, бронзу, меха, мебель и др.
Ш. М. Рапопорт,
Ул. Мицкевича (Захарьевская) № 45. 409.

Мяняльная кантора
Н. Гальперына, Н. Ідэльчыка і Ко
Койданаўская 22.
Купля і прадажа розных валют. № 404.

Незалежная Думка
палітычна-грамадзянская і літэратурная часопісь.
Выходзіць у Вільні што тыдзень.
Рэдактар—Г. Багдановіч.
Выдавец—У. Знамяроўскі.
Рэдакцыя і адміністрацыя: *Вострабрамская 9—5.*
Асобны нумар 2 мар., на 1 год 100 мк., на 6 месяцаў 50 мк., на 3 мес. 25 мк., на 1 мес. 8 мар.

РУНЬ
Ад 1 мая г. г. у Менску выходзіць новая часопісь.
Рунь *беларускае літэратуры і мастацтва.*
Рунь у ліку сваіх супрацоўнікаў мае самые найпаважнейшые літэратурные і мастацкіе сілы.
Рунь захоплівае сваім зьместам беларускае пісьменства, поэзію, гісторыю, памяткі мінуўшчыны, крытыку і г. д.
Рунь служыць вялікім ідэалам красы і свабоды.
Рунь выходзіць ня меней 4-х разоў у месяць.
Рунь каштуе з перасылкай толькі 5 марак за адзін нумар, (двайны нумар 10 м.), на 1 м-ц. — 20 мар., на 3 мес. — 60 мар.
Рунь выходзіць пад рэдакцыяй Янкі Луцэвіча, выдавец проф. Вацлаў Івноўскі.
Адрэс: Рэдакцыя—Менск, Кашарская 10, кв. 5, (адчын. ад 10 да 11 г. зр.).
Адміністрацыя: вул. Міцкевіча, Беларускі Дом (адчын. ад 9 да 3 г. дня). 298

З дазв. вайсков. цэнзуры № 521. 21/VI.

Менск. Друкарня Інвалідаў.

15Н 11/133